## не толькі ў каталогах

# Планета Арсеня Ліса

XIII навукова-краязнаўчая канферэнцыя, прысвечаная навуковай дзейнасці доктара філалагічных навук, пісьменніка Арсеня Ліса, прайшла ў Маладзечанскай цэнтральнай бібліятэцы. Заўзятаму фалькларысту сёлета споўнілася б 85 гадоў. Калісьці цікавасць да народнай песні і да грамадскага нацыянальнага руху 20-х гадоў мінулага стагоддзя вызначыла тэмы экспедыцый і лёс даследчыка Арсеня Ліса ў навуцы.

Арганізатар канферэнцыі, краязнаўца, выдавец, пісьменнік Міхась Казлоўскі адзначыў, што найбольшая заслуга Арсеня Сяргеевіча ў тым, што ён быў не толькі дбайным збіральнікам фальклору, але і першым даследчыкам, які вывучаў навуковую і літаратурную спадчыну тэарэтыка мастацтва Мікалая Шчакаціхіна, мастака Язэпа Драздовіча ды многіх слынных беларусістаў. Супрацоўнікі цэнтральнай бібліятэкі падрыхтавалі фотапрэзентацыю, у якой можна было ўбачыць шмат рэдкіх фотаздымкаў з сямейнага архіва А. Ліса.

На судакрананні дзвюх слынных асоб — Арсеня Ліса і Язэпа Драздовіча — акцэнтаваў увагу краязнаўца Валеры Бурэнь. Абодва краязнаўцы насуперак абставінам падымалі пласты занядбанай гісторыі краю, стваралі і ўзбагачалі беларускую культуру. Іх, па словах выступоўцы, аб'ядноўваў адзін грамадзянскі доўг — паказаць канкрэтную, а не абстрактную надуманую Беларусь.

Па колькасці зробленых запісаў Арсень Ліс — у пяцёрцы найбольш плённых збіральнікаў беларускага фальклору, адзначыла малады навуковец Яніна Грыневіч з інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі. Арсень Ліс быў таленавіты сцэнарыст, лічыць вядучы рэдактар студыі «Летапіс» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», пісьменнік Уладзімір Мароз. Шкада, што многія фільмы, знятыя па яго сцэнарыі, пакуль не алічбаваныя: яны не страцілі актуальнасці па сённяя.

Паэтэса, вядучы бібліёграф Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Людміла Сільнова расказала пра электронны каталог, што ўтрымлівае творы з друкаванай спадчыны Арсеня Ліса, у тым ліку і вельмі кранальныя лірычныя вершы. На думку выступоўцы, Арсень Сяргеевіч стварыў сваю планету Беларусь, якая асацыюецца з планетамі з казкі А. Экзюперы «Маленькі прынц». Баладу, прысвечаную Арсеню Лісу, прачытаў паэт Віктар Шніп.

**Ала КЛЕМЯНОК**